**Беларуская Каталіцкая Уніяцкая Царква**
**Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла**

# АБРАД ШЛЮБУ

Выдавецтва "Божым шляхам"
Лёндан 1992

Абрад шлюбу
Пераклад на беларускую мову а. Аляксандра Надсона.
©Выдавецтва "Божым шляхам" Апостальскага Візытатара
для Беларусаў,1992
Marian House, Holden Avenue, London N12 8HY, England

# І. АБРАД АБМЕНУ ПЯРСЬЦЁНКАЎ (ЗАРУЧЫНЫ)

*Сьвятар сустракае маладых перад райскімі дзьвярамі і пачынае:*

**Сьвятар:** Блаславёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** У супакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся. (*Так пасьля наступных просьбаў*)

**Сьвятар:** За супакой з вышыняў і збаўленьне душ нашых Госпаду памолімся.

— За супакой на ўсім сьвеце, добры стан сьвятых Божых цэркваў і зьяднаньне ўсіх Госпаду памолімся.

— За гэтую сьвятую царкву і тых, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

— За Сьвятога Айца нашага сусьветнага Біскупа ...., Папу Рымскага, дастойнага Арцыбіскупа (*або* багалюбнага Біскупа) нашага ....., пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце, усё духавенства і людзей Госпаду памолімся.

— За яго (яе) міласьць .... (*імя галавы дзяржавы*), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны, Госпаду памолімся.

— За слугаў Божых .... і .... , якія абяцаюць сабе вернасьць і любоў да сьмерці, і за іхняе збаўленьне, Госпаду памолімся.

— Каб ім былі дадзеныя дзеці для прадаўжэньня роду іх, і споўніліся іхнія просьбы, Госпаду памолімся

— Каб ім была пасланая дасканалая і мірная любоў, Госпаду памолімся.

— Каб ім захавацца ў згодзе і вернасьці, Госпаду памолімся.

— Каб ім быць блаславёнымі ў беззаганным жыцьці, Госпаду памолімся.

— Каб Госпад Бог дараваў ім пачэснае сужэнства і ложа чыстае, Госпаду памолімся.

— Каб нам выбавіцца ад усякага гневу суму і недастатку, Госпаду памолімся

— Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

— Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін

**Сьвятар:** Спрадвечны Божа, што зьяднаў разьедданых, злучыўшы іх у непарушным саюзе любові; і блаславіў Ісаака і Рэбэку, зрабіўшы іх спадкаемцамі Твайго абяцаньня: блаславі слуг Тваіх ... і ...., настаўляючы іх на ўсякую добрую справу.

Бо Ты міласэрны і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін

**Сьвятар:** Мір усім.

**Людзі:** І твайму духу.

**Сьвятар:** Галовы вашы **Госпаду схіліце.**

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Госпадзе Божа наш, які заручыў сабе Царкву быццам чыстую нявесту спасярод народаў, блаславі гэтыя заручыны, зьяднай і захавай у супакоі і згодзе слуг Тваіх.

Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

*Сьвятар робіць пярсьцёнкам маладой знак крыжа над маладым і кажа:*

**Сьвятар:** Слуга Божы ...... заручаецца са слугой Божай ...... у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

*У падобны спосаб робіць пярсьцёнкам маладога знак крыжа над маладой, кажучы:*

**Сьвятар:** Слуга Божая ..... заручаецца са слугой Божым .... у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

*Пасьля дае пярсьцёнкі ў іхнія правыя рукі. Маладыя абменьваюцца пярсьцёнкамі, а сьвятар моліцца:*

**Сьвятар:** Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Госпадзе Божа наш, Ты спадарожнічаў слузе патрыярха Абрагама , калі той, будучы пасланы ў Мэзапатамію, каб прывесьці адтуль нявесту для сына

ягонага Ісаака , заручыў яго з Рэбэкаю, якую ён пазнаў у чэрпаньні вады. Цяпер, Госпадзе, блаславі заручыны гэтых тваіх слугаў ....і ...., і ўчыні непарушным абяцаньне, якое яны далі адзін аднаму. Умацуй іх у сьвятой еднасьці, што паходзіць ад Цябе. Бо Ты ў пачатку зрабіў мужчыну і жанчыну, і злучыў жанчыну з мужчынай, каб яна была спадарожніцай яму, і для прадаўжэньня роду людзкога. Глянь ласкава на слугаў Тваіх ...і ...., і ўмацуй іхні саюз у веры і аднадумстве, у праўдзе і любові. Бо Ты, Госпадзе, устанавіў, што раз дадзенае абяцаньне павінна быць нязьменным ва ўсім. Пярсьцёнкам была даная Язэпу ўлада ў Ягіпце; пярсьцёнкам Даніла праславіўся ў краіне Бабілёнскай; пярсьцёнкам Тамара была апраўданая; пярсьцёнкам Айцец наш Нябесны паказаў спагадлівасьць сыну, калі сказаў: "Дайце пярсьцёнак на правую руку яго і, забіўшы кормнае цялё, будзем весяліцца". Тваёй правай рукой, Госпадзе, Ты ўмацаваў Майсея ў Чырвоным Моры. Словам праўды Тваёй былі ўстаноўленыя нябёсы і асновы зямлі. І правыя рукі слуг Тваіх хай будуць таксама блаславёныя Тваім магутным словам, і Тваёй узьнесенай рукой. Дзеля гэтага, Госпадзе, блаславі гэты абмен пярсьцёнкаў Тваім нябесным блаславеньнем.

Бо Ты той, хто благаслаўляе і асьвячае ўсё, і Табе славу аддем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

# II. АБРАД ВЯНЧАНЬНЯ (ШЛЮБ)

**Людзі:** Слава Табе Божа наш, слава Табе.

**Чытальнік:** Блаславёныя ўсе, што баяцца Госпада, і што ходзяць Ягонымі шляхамі.

**Людзі:** Слава Табе Божа наш, слава Табе. (*Так пасьля наступных вершаў*)

**Чытальнік:** Калі будзеш карміцца з працы рук тваіх, дык будзеш шчасьлівы і добра табе будзе.

— Жонка твая будзе быццам пладавіты куст вінаградны ў зацішшы дому твайго.

— Сыны ж твае быццам аліўныя галінкі вакол стала твайго.

— Так будзе блаславёны той, хто баіцца Госпада.

— Няхай блаславіць цябе Госпад з Сыёну, каб ты бачыў дабрабыт Ерусаліму праз усе дні жыцьця твайго.

— Каб ты дачакаўся бачыць дзяцей сыноў тваіх. Мір Ізраілю.

**Людзі:** Слава Табе Божа наш, слава Табе.

## Апытаньне маладых

**Сьвятар:** НН. ... , ці ты маеш моцны і непахісны намер дабравольна і непрымушана ўзяць ММ... , што вось тут стаіць побач з табою, за тваю жонку?

**Малады:** Так, пачэсны ойча

**Сьвятар:** Ці ты не абяцаўся іншай жанчыне?

**Малады:** Не, пачэсны ойча.

**Сьвятар:** ММ...., ці ты маеш моцны і непахісны намер дабравольна і непрымушана ўзяць НН...., што вось стаіць побач з табою, за твайго мужа?

**Маладая:** Так, пачэсны ойча.

**Сьвятар:** Ці не абяцалася ты іншаму мужчыне?

**Маладая:** Не, пачэсны ойча.

## Мірная літанія і малітвы

**Сьвятар:** Блаславёнае валадарства Айца і Сына, і Сьвятога Духа цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** У супакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся. (*Так пасьля наступных просьбаў*)

**Сьвятар:** За супакой з вышыняў і збаўленьне душ нашых Госпаду памолімся.

— За супакой на ўсім сьвеце, добры стан сьвятых Божых цэркваў і зьяднаньне ўсіх Госпаду памолімся.

— За гэтую сьвятую царкву і тых, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

— За Сьвятога Айца нашага сусьветнага Біскупа ....., Папу Рымскага, дастойнага Арцыбіскупа (*або* багалюбнага Біскупа) нашага ......, пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце, усё духавенства і людзей Госпаду памолімся.

— За яго (яе) міласьць ...... (*імя галавы дзяржавы*), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны, Госпаду памолімся.

— За слугаў Божых .... і .... , якія сёньня ўступаюць у сужэнскі стан, і за іхняе збаўленьне, Госпаду памолімся.

— Каб іхняе сужэнства было блаславёнае, як сужэнства ў Кане Галілейскай, Госпаду памолімся.

— Каб ім захавацца ў чысьціні і мець плод улоньня іх на радасьць і карысьць, Госпаду памолімся.

— Каб ім цешыцца ў прысутнасьці іхніх сыноў і дачок, Госпаду памолімся.

— Каб усе іхнія просьбы адносна іхняга збаўленьня былі споўненыя, Госпаду памолімся.

— Каб ім і нам выбавіцццца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

— Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

— Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Усячысты Божа і Творча ўсяго што існуе, у чалавекалюбстве Тваім Ты зрабіў з рабра праайца нашага Адама жанчыну і паблаславіў іх, кажучы:"Расьціце і размнажайцеся і валодайце зямлёю". У сужэнстве Ты злучыў іх у адно. Дзеля гэтага мужчына пакіне свайго бацьку і маці і прыстане да жонкі сваёй, і будуць двое адно цела. Таму тое, што Бог злучыў, хай ніякі чалавек не разлучае. Ты паблаславіў слугу Твайго Абрагама і, вызваліўшы Сару ад няплоднасьці, учыніў яго бацькам вялікага народу. Ты даў Ісаака Рэбэцы і паблаславіў яе на дзетараджэньне. Ты злучыў Якуба з Рахільлю і ўчыніў яго бацькам дванаццацёх патрыярхаў. Ты злучыў Язэпа і Асанэту, і даў ім двух сыноў, Эфраіма і Манасію. Ты прыняў Захара і Альжбету і паслаў ім сына, Прадвесьніка (Гасподняга). З кораня Ясея паводле цела Ты даў нарадзіцца Дзеве, і ад яе Ты сам прыняў цела і стаўся чалавекам для збаўленьня людзей.

У Тваёй невыказнай шчодрасьці і бязьмежнай дабраце Ты прыйшоў у Кану Галілейскую і паблаславіў там шлюб каб паказаць, што законнае сужэнства і дзетараджэньне — гэта Твая воля.

Найсьвяцейшы Госпадзе, прымі нашы малітвы бо мы — слугі Твае. Як Ты прыйшоў тады ў Кану, так прыйдзі нябачна сюды і паблаславі гэтае сужэнтва, дай слугам Тваім .... і .... мірнае, доўгае і беззаганнае жыцьцё, і ўзаемную любоў, якая зьяўляецца зарукай супакою. Пашлі ім дзетак і паблаславі іх даўгалецьцем: хай яны дзякуюць Табе за сваіх дзетак — вянец славы іх.

Дай, каб яны маглі бачыць дзетак дзяцей сваіх, захавай іхняе сужэнства ад спакусаў, пашлі ім расу з неба і дай ім удзел у багацьцях гэтай зямлі. Напоўні дом іх дастаткамі, каб яны дзяліліся імі з тымі, што ў патрэбе. Дай таксама тым, што будуць жыць з імі, усё неабходнае для збаўленьня.

Бо Ты міласьцівы, шчодры і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Госпаду памолімся:

**Людзі**: Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар**: Блаславёны Ты, Госпадзе Божа наш, Сьвятару тайнага і чыстага духоўнага сужэнства, і Заканадаўча цялеснага жанімства, Падаўча несьмяротнасьці, Крыніца ўсяго добрага. Ты, Уладару, стварыўшы спачатку чалавека і паставіўшы яго царом стварэньня, сказаў: "Нядобра быць чалавеку аднаму на зямлі: створым памочніка яму"; і ўзяўшы адно з рэбраў ягоных, зрабіў жанчыну, убачыўшы якую Адам сказаў: "Вось косьць ад касьцей маіх, і цела ад цела майго: назавецца яна жонкай, бо была ўзятая ад мужа свайго. Дзеля гэтага чалавек пакіне бацьку свайго і маці сваю і прыстане да жонкі сваёй, і будуць двое адно цела, бо што злучыў Бог, хай чалавек не разлучае". Дык цяпер зышлі, Госпадзе, Уладару і Божа наш,ласку Тваю на гэтых вось слугаў Тваіх .... і ...., каб яны жылі згодна з воляй Тваёй.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Абрагама і Сару.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Ісаака і Рэбэку.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Якуба і ўсіх патрыярхаў.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Язэпа і Асанэту.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Майсея і Сэпфору.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Якіма і Ганну.

Блаславі іх, Госпадзе Божа наш, як Ты блаславіў Захара і Альжбету.

Захавай іх, Госпадзе Божа наш, як Ты захаваў Ёну ў нутры кіта.

Захавай іх, Госпадзе Божа наш, як Ты захаваў трох сьвятых юнакоў у агні, пасылаючы ім расу з неба.

Хай радасьць іх будзе, як радасьць Алены, калі яна знайшла сьвяты пачэсны крыж.

Успомні іх Госпадзе, як Ты ўспомніў Энаха, Сіма і Гальляша.

Успомні іх Госпадзе, як Ты ўспомніў сорак мучанікаў, якім Ты паслаў кароны з неба.

Успомні Госпадзе, бацькоў іх, паколькі малітвы бацькоў умацоўваюць асновы дамоў.

Успомні, Госпадзе Божа наш, слугаў Тваіх .... і ...., і блаславі іх. Даруй ім плод улоньня іх — дзетак добрых, — і аднадушнасьць цела і душы. Узвысь іх, як кедры лібанскія і як вінаградны куст пладавіты, каб яны, маючы ўсяго ўдосталь, багацелі ўчынкамі прыемнымі Табе; і дай ім бачыць дзетак дзяцей іх, быццам галінкі аліўныя вакол стала; і дагаджаючы Табе, хай яны зьзяюць быццам зоркі на небе. Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава Айца, і Сына, і Сьвятога Духа цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Божа сьвяты, Ты стварыў чалавека з пылу зямлі, і даў яму жонку з рабра ягонага, як ~~таварышку~~ і спадарожніцу жыцьця, бо Велічы Тваёй здавалася добрым, каб чалавек ня быў адзін на зямлі. Дык і цяпер, Уладару, працягні руку Тваю сьвятую з сьвятога жыльля Твайго і злучы слугаў Тваіх .... і ..., бо гэта Ты, які злучаеш мужа з жонкаю. Злучы іх у адзінстве думкі, вянчай іх на любоў, дай ім мець плод улоньня — дзетак добрых.

Бо Твая ёсьць дзяржава і Тваё валадарства, і сіла, і слава Айца, і Сына, і Сьвятога Духа цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

## Абяцаньне вернасьці

*Маладыя падаюць сабе правыя рукі, а сьвятар абвязвае іх накрыж епітрахілем. Тады маладыя даюць сабе наступнае ўрачыстае абяцаньне:*

**Малады:** Я .... бяру цябе, ...... за жонку і абяцаю табе любоў, веру і вернасьць сужэнскую да сьмерці: так хай мне паможа Бог у Тройцы Сьвятой адзіны,і ўсе сьвятыя.

**Маладая:** Я .... бяру цябе, ...... за мужа і абяцаю табе любоў, веру і вернасьць сужэнскую да сьмерці: так хай мне паможа Бог у Тройцы Сьвятой адзіны, і ўсе сьвятыя.

**Сьвятар** *разьвязвае маладым рукі, бласлаўляе іх і кажа:*

Што Бог злучыў, хай чалавек не разлучае.

## Вянчаньне

*Сьвятар бярэ вянок, бласлаўляе ім жаніха і накладае яму на галаву, кажучы:*

**Сьвятар:** Слуга Божы ..... вянчаецца слузе Божай .... у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

*У падобны спосаб робіць з нявестай:*

Слуга Божая .... вянчаецца слузе Божаму.... ў імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

*Тады бласлаўляе іх тры разы, кажучы:*

Госпадзе Божа наш, славаю і пашанаю вянчай іх.

## Апостал і Евангельле

**Сьвятар:** Будзьма ўважлівыя. Мір усім.

**Людзі:** І твайму духу.

**Сьвятар:** Мудрасьць.

**Чытальнік:** (*чытае пракімен*) Ты ўсклаў вянцы з дарагіх каменьняў на галовы іх; жыцьця прасілі ў цябе, і Ты даў яго ім.

Ты дасі ім блаславеньне Тваё на век вякоў, узрадуеш іх радасьцю перад абліччам Тваім.

**Сьвятар:** Мудрасьць

**Чытальнік:** Чытаньне пасланьня сьвятога Апостала Паўлы да Эфэсцаў.

**Сьвятар:** Слухайма ўважліва.

**Чытальнік:** Браты! Дзякуйце заўсёды і за ўсё Богу і Айцу ў імя Госпада нашага Ісуса Хрыста, пакараючыся сабе ўзаемна ў страху Божым. Жонкі, слухайцеся мужоў сваіх, як Госпада, бо муж зьяўляецца галавой жонкі, як і Хрыстос — Галава Царквы, Ён жа і Збавіцель цела. Але як Царква паслухмяная Хрысту, так і жонкі мужам — ва ўсім. Мужы, любіце жонкі вашы, як і Хрыстос палюбіў Царкву і аддаў сябе за яе, каб асьвяціць яе, ачысьціўшы абмыццём вадою, пры саўдзельніцтве слова, каб паставіць Царкву пачэснаю, без плямы і заганы, ці нечага падобнага, але каб яна была сьвятой і беззаганнай. Гэтак павінны мужы любіць сваіх жонак, як целы свае: хто любіць жонку сваю, самога сябе любіць. Бо ніхто ніколі ня меў нянавісьці да свайго цела, але жывіць яго і грэе, як і Госпад Царкву. Бо мы члены цела Яго, ад цела Яго і ад касьцей Яго. Дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку свайго і маці сваю і злучыцца з жонкай сваёй, і будуць абое адно цела. Тайна гэтая вялікая: я ж кажу аб Хрысьце і Царкве. У канцы ж хай кожны з вас таксама любіць жонку сваю, як самога сябе; а жонка хай слухаецца мужа свайго. (*Эф. 5:20-33*).

**Сьвятар:** Мір табе, чытальнік.

**Чытальнік:** І твайму духу. Алілуя, алілуя, алілуя.

Ты, Госпадзе, захавай іх і абарані іх ад гэтага роду давеку.

Алілуя, алілуя, алілуя.

**Сьвятар**: Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць сьвятое Евангельле. Мір усім.

**Людзі**: І твайму духу.

**Сьвятар**: Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Яна.

**Людзі**: Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

**Сьвятар**: Слухайма ўважліва! У той час было вясельле ў Кане Галілейскай і Маці Ісуса была там. Ісус і вучні Ягоныя былі таксама запрошаныя на вясельле. Калі ж не хапіла віна, Маці Ісуса кажа Яму: "Ня маюць больш віна". Але Ісус адказаў ёй: "Што табе і мне да гэтага, жанчына? Мой час яшчэ не прыйшоў". Тады Маці сказала слугам: "Рабіце ўсё, што Ён вам скажа". Там было шэсьць каменных збаноў, прызначаных для гэбрэйскіх ачышчэньняў, кожны з якіх мог зьмясьціць дзьве або тры меры. Ісус сказаў ім: "Напоўніце збаны вадою". Яны напоўнілі да верху. Тады сказаў ім: "Зачэрпніце і занясіце вясельнаму старасту". Яны панесьлі. Калі той папробаваў вады, якая сталася віном — бо ён ня ведаў, адкуль яно, хоць слугі, якія чэрпалі ваду, ведалі, — ён паклікаў маладога і сказаў яму: "Кожны чалавек перш дае добрае віно, а калі нап'юцца, тады дае горшае. Ты ж захаваў добрае віно аж да гэтае пары". Гэты цуд у Кане Галілейскай быў пачаткам цудаў зробленых Ісусам. Ён паказаў хвалу сваю і вучні Ягоныя ўверылі ў Яго. (*Ян 2:1-11*)

**Людзі**: Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

## Літаніі

**Сьвятар**: Скажам усе разам ад усяе душы, ад усяе думкі нашае скажам.

**Людзі**: Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Госпадзе ўсемагутны, Божа айцоў нашых, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Зьмілуйся над намі Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся (*Тройчы*).

**Сьвятар:** Яшчэ молімся, за зьмілаваньне, жыцьцё, супакой, здароўе, збаўленьне і наведаньне слуг Божых.... і ...., бацькоў, братоў і сёстраў і ўсёй радні іх.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся (*Тройчы*).

**Сьвятар:** Бо ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Госпаду, памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Госпадзе Божа наш, які ў збавенным Тваім провідзе Тваёй прысутнасьцю ў Кане Галілейскай ушанаваў сужэнскі стан: захавай тваіх слугаў.... і....., якіх Ты захацеў злучыць між сабою; Зрабі іх сужэнства беззаганным і пачэсным, захавай іх у супакоі і аднадушнасьці, ахоўвай чысьціню ложа іх, і памажы ім весьці жыцьцё бездакорнае і дажыць да глыбокай старасьці, захоўваючы Твае прыказаньні ў чыстым сэрцы.

Бо Ты Бог наш, які мілуеш і збаўляеш, і мы славу Табе аддаем, разам, з адвечным Тваім Айцом і з усесьвятым, добрым і жыцьцядайным Тваім Духам цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі**: Амін.

**Сьвятар**: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі**: Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар**: Каб увесь гэты дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

**Людзі**: Дай нам, Госпадзе. (*Так пасьля наступных просьбаў*).

**Сьвятар**: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

— Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

— Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і спакою для сьвету ў Госпада просім.

— Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў спакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

— Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага, і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

— Папрасіўшы адзінства веры і супольнасьці Духа Сьвятога, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

**Людзі**: Табе, Госпадзе.

**Сьвятар**: І зрабі нас дастойнымі, Уладару, з поўным даверам і без асуджэньня сьмець зьвяртацца да Цябе, Бога Нябеснага, як да Айца, і казаць:

**Людзі**: Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня і

адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым. І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Тваё бо ёсьць валадарства і сіла, і слава Айца, і Сына, і Сьвятога Духа цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Мір усім!

**Людзі:** І твайму духу.

**Сьвятар:** Галовы нашы Госпаду схілім.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

## Супольная чаша і працэсыя

*Прыносіцца супольная чаша.*

**Сьвятар:** Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Божа, які сілаю Тваёю стварыў усё, заснаваў сусьвет і ўпрыгожыў вянец тварэньня Твайго, благаславі благаславеньнем Тваім духоўным чашу гэтую супольную, якая даецца тым, што толькі-што зьядналіся для супольнага жыцьця ў сужэнскім стане.

**Людзі:** Амін.

*Сьвятар дае тройчы чашу, перш маладому а пасьля маладой. Пасля абводзіць тройчы маладых вакол ахвярніка. У міжчасе людзі сьпяваюць:*

**Людзі:** (*тон 5*). Ісая, радуйся, бо вось Дзева ва ўлоньні зачала і нарадзіла сына Эмануэля, Бога і чалавека — Усход імя Яго. Аддаючы хвалу Яму, Дзеву ўзьвялічваем.

(*тон 7*). Сьвятыя мучанікі, што мужна змагаліся і атрымалі вянцы перамогі, маліцеся Госпаду, каб Ён даў зьмілаваньне душам нашым.

Слава Табе Хрысьце Божа, апосталаў хвала і радасьць мучанікаў, якія прапаведавалі Тройцу адзінасутную .

## Зьняцьце вянцоў і заканчэньне

**Сьвятар:** (*здымае вянец з жаніха*): І ты, жаніх, будзь узьвялічаны як Абрагам і бласлаўлёны як Ісаак, і хай нашчадкі твае будуць так шматлікія, як нашчадкі Якуба. Жыві ў супакоі і захоўвай прыказаньні Божыя ад шчырага сэрца.

(*Здымае вянец з нявесты*). І ты, нявеста, будзь узьвялічаная як Сара, поўная радасьці як Рэбэка, і хай будзе ў цябе дзетак як у Рахілі; жыві ў вясельлі разам з мужам тваім і захоўвай прыказаньні закону, бо такая ёсьць воля Божая.

**Сьвятар:** Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Божа, Божа наш, які прыйшоў у Кану Галілейскую і там блаславіў шлюб, блаславі таксама слуг тваіх, якія толькі-што провідам Тваім злучыліся ў сужэнстве. Блаславі іхнія прыйсьці і выхады. Напоўні жыцьцё іхняе ўсякім дабром. Прымі вянцы іхнія ў Тваім валадарстве, захоўваючы іх чыстымі, беззаганнымі і бясьпечнымі давеку.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Мір усім.

**Людзі:** І твайму духу.

**Сьвятар:** Галовы вашы Госпаду схіліце.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Айцец Сын і Дух Сьвяты, найсьвятая, адзінасутная і жыцьцядайная Тройца, адзінае Боства і адзінае ўладарства, хай блаславіць вас і дасьць вам даўгалецьце, добрых дзетак, і посьпех у жыцьці і веры; і хай напоўніць вас усякім дабром зямным і зробіць дастойнымі абяцаных дароў нябесных, малітвамі Багародзіцы і ўсіх сьвятых. Амін.

*Сьвятар віншуе маладых і дае кароткае настаўленьне. Маладыя цалуюць адзін аднаго і атрымліваюць віншаваньні ад прысутнытх.*

**Сьвятар:** Мудрасьць.

**Людзі:** Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога Слова, існую Багародзіцу, цябе мы ўзьвялічваем.

**Сьвятар:** Слава Табе, Хрысьце Божа наш, надзея наша, слава Табе.

**Людзі:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу цяпер і заўсёды і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. Ойча, блаславі.

**Сьвятар:** Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які сваёй прысутнасьцю ў Кане Галілейскай паказаў, што сужэнства — гэта пачэсны стан, малітвамі Найчыстае свае Маці, сьвятых слаўных і пахвалы годных апосталаў, сьвятых і пераможных мучанікаў, сьвятых і баганосных айцоў нашых і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

**Людзі:** Амін.

